© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011


# БАЦЬКАЎШЧЫНА

ЦАНА 50 Н. ФЭН. — PREIS 50 Pf.

ОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „BAĆKAUŠČYNA“ („VATERLAND“)

Herausgeber: Wladimir BORTNIK

Postadresse: Die Weissruthenische Zeitung „Baćkauščyna“ („Das Vaterland“) (8) München 19. Schliessfach 69.

Druck: „LOGOS“, Buchdruckerei u. Verlag, G.m.b.H., München 19, Bothmerstr. 14

**Цана: Нямеччына** (іншыя эўрапэйскія краіны бяз Францыі й паўдзённаамэрыканскія краіны): год — 12,5 н. м.; **ЗША й Канада:** год — 6,5 дал.; **Ангельшчына й Аўстралія:** год — 30 шыл.; **Францыя:** год – 12,5 н. ф. **Паўгода — палавіна пададзенае цаны. Перасылка лётніцкай поштай у ЗША й Канаду каштуе падвойна, у Аўстралію й краіны Паўднёвай Амэрыкі — патройна. Падвойныя нумары каштуюць падвойна.**

Банковае конто: Zeitung „Baćkauščyna“, Konto Nr. 357-125, Bay. Hypotheken- u. Wechselbank, München.

LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE“ | DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND“ | THE BELORUSSIAN NEWSPAPER „THE FATHERLAND“

№ 11 (611) Кастрычнік, 1963 ГОД ВЫДАНЬНЯ 17


# Эра Адэнаўэра

Пасьля 14-гадовага прабываньня на становішчы Канцлера Нямецкай Фэдэратыўнай Рэспублікі Конрад Адэнаўэр пайшоў у дымісію. «Эра Адэнаўэра‘ ў пасьляваеннай гісторыі Нямеччыны закончаная. Варта зрабіць кароткае падсумаваньне дзейнасьці гэтага выдатнага дзяржаўнага дзеяча сучаснасьці, які прысьвяціў сябе ня толькі служэньню свайму народу, але й такім высокім ідэалам, як мірнае супрацоўніцтва эўрапэйскіх краінаў і дабрабыт іхных народаў.

Конрад Адэнаўэр нарадзіўся 5 студзеня 1876 году ў сям'і ўрадоўца ў горадзе Кэльне. Пасьля заканчэньня гімназіі ў Кэльне ён наведваў унівэрсытэты ў Фрайбургу, Мюнхэне і Боне, дзе вывучаў права і эканоміку. Ад 1902 да 1906 году Конрад Адэнаўэр з тытулам доктара працуе ў сваёй прафэсіі. Ужо ў раньняй грамадзкай дзейнасьці Адэнаўэра выяўляюцца рысы, характэрныя для ягонай будучай дзяржаўнай дзейнасьці. У 1917 годзе, будучы выбраным бургомістрам свайго роднага гораду, Адэнаўэр падымае яго з руінаў першай сусьветнай вайны. Да ліпеня 1933 году Адэнаўэр зьяўляецца актыўным удзельнікам грамадзкага і палітычнага жыцьця Нямеччыны, спрычыняецца да разьвіцьця эканомікі і культуры краіны.

З прыходам да ўлады Гітлера, Адэнаўэр быў звольнены з займанага ім становішча бургомістра як «ненадзейны» і высланы з раёну Кэльну. У 1934 годзе яго арыштоўвае гэстапо, але пасьля некаторага часу вызваляе. Калі ў 1944 годзе на Гітлера быў зроблены атэнтат, Адэнаўэр быў арыштаваны зноў і яму пагражалі растрэлам, але й гэтым разам яму ўдалося ўцалець.

Пасьля Другой сусьветнай вайны Нямеччына ляжала ў руінах. Тут зноў прыгадалі Адэнаўэра, якому тады было ўжо 70 год. Акупацыйныя ўлады запрапанавалі яму ягонае ранейшае становішча бургомістра Кэльну. На гэтым становішчы Адэнаўэр пратрымаўся нядоўга, бо ангельскія акупацыйныя ўлады палічылі яго няздольным кіраваць горадам... Але Адэнаўэр не застаецца бязьдзейным. Ён пачаў ажыцьцяўленьне свае ранейшае мэты, заснаваўшы нямецкую хрысьціянска-дэмакратычную партыю.

Тры гады пасьля заканчэньня вайны на тэрыторыі былых амэрыканскай, ангельскай і францускай зонаў Нямеччыны нямецкі народ атрымлівае права і магчымасьць свабодна выбраць свой парлямант і ўрад. У выніку выбараў перамагае хрысьціянска-дэмакратычная партыя на чале з Адэнаўэрам. Пад ягоным кіраўніцтвам маладая нямецкая дэмакратыя выйшла неўзабаве на шырокую арэну міжнароднае палітыкі, а ўнутры краіны пачаўся нябывалы эканамічны ўздым, дзякуючы, не ў апошнюю чаргу, шчодрай амэрыканскай фінансавай дапамозе.

Імя канцлера Адэнаўэра становіцца сусьветна выдомым. У веку, калі іншыя шукалі сабе супакою, Адэнаўэр выяўляе нязвычайную энэргію і выдатныя якасьці дзяржаўнага мужа. Не шкадуючы высілку ў кірунку аб'еднаньня Нямеччыны мірным шляхам, ён зьяўляецца гарачым прыхільнікам эканамічнага і палітычнага аб'еднаньня Эўропы і ўмацаваньня Атлянтычнага абароннага саюзу. Шматлікія падарожжы па розных краінах сьвету прынесьлі Адэнаўэру ня толькі палітычны і дыпляматычны посьпех, але й 20 ганаровых доктарскіх тытулаў.

На апошніх перавыбарах прэзыдэнта Нямецкай Фэдэратыўнай Рэспублікі ў 1959 годзе на гэтае становішча была выстаўленая кандыдатура д-ра Адэнаўэра. Будучы перакананы ў тым, што на становішчы канцлера ён зможа зрабіць больш карыснага для народу і краіны, Адэнаўэр адмаўляецца кандыдаваць на гэтае ганаровае становішча. З прычыны ягонага веку — яму было ўжо тады 84 гады — гэтая ягоная пастанова выклікала крытыку некаторай часткі грамадзкасьці.

Цесны саюз Нямеччыны з заходнімі краінамі, умацаваньне Атлянтычнага Саюзу НАТО, эканамічнае й палітычнае аб'еднаньне Эўропы і прымірэньне Нямеччыны з Францыяй — гэта галоўныя тэндэнцыі й дасягненьні Нямеччыны эры Адэнаўэра. Перад адыходам з становішча Канцлера Адэнаўэр аднак сам акрэсьліў як галоўнае дасягненьне свае палітычнае кар'еры прымірэньне з Францыяй. Аб гэтым ён таварыў:

«Бяз прымірэньня паміж Нямеччынай і Францыяй Эўропа ня можа быць створаная. Бяз гэтага прымірэньня і дружбы ня будзе таксама і міру ў Эўропе. Падпісаньне гэтага пагадненьня — гэта галоўная апора міру паміж Францыяй і Нямеччынай, і разам з тым, міру ў Эўропе і ўва ўсім сьвеце.»

Нямецка-францускі саюз — годнае завяршэньне бліскучай кар'еры Адэнаўэра. Цяпер, калі ён пасьля 14 год прабываньня на становішчы Канцлера перадае кіраўніцтва адроджанай, квітнеючай Нямеччыны у іншыя рукі, увесь сьвет прызнае, што ён пакінуў па сабе памяць дзяржаўнага дзеяча і палітыка, пра якога гісторыя не забудзецца.

# БССР падпісала маскоўскую ўмову

8-га кастрычніка Беларуская і Ўкраінская ССР далучыліся да маскоўскага пагадненьня аб частковай забароне ядзерных выпрабаваньняў. Можна ня сумнявацца, што сусьветная грамадзкасьць усприме гэтую вестку з задаваленьнем, бо чым больш краінаў падпішацца пад умовай, якая абяцае зьліквідаваць небясьпеку далейшага атручваньня атмасфэры радыяактыўнымі элемэнтамі — тым лепш. Але акт падпісаньня прадстаўнікамі БССР і УССР гэтай міжнароднай умовы мае сваю спэцыфіку і заслугоўвае на тое, каб над ім спыніцца. Папершае — з прычыны статусу, якім гэтыя дзьве савецкія рэспублікі карыстаюцца ўнутры СССР і ў міжнародных дачыненьнях, і падругое — з прычыны аб'екту самога пагадненьня. Тут мы сустракаемся з старымі супярэчнасьцямі, толькі гэтым разам яшчэ больш яскравымі.

Нікому не сакрэт, што Беларуская і Ўкраінская ССР, хоць і маюць намінальнае права наладжваць беспасярэднія дыпляматычныя сувязі з замежнымі дзяржавамі й падпісваць міжнародныя пагадненьні, на самай справе ніякіх самастойных пастановаў у вонкавапалітычных пытаньнях да гэтага часу прымаць ня могуць. Да гэтага часу ў Беларускай ССР няма, напрыклад, ніводнага замежнага дыпляматычнага прадстаўніцтва, а БССР ня мае ніводнага свайго прадстаўніка, акрэдытаванага пры ўрадзе іншай краіны. Як ведама, савецкая вонкавая палітыка максімальна сканцэнтраваная ў руках маскоўскага ўраду. Гэткае палажэньне існуе, зрэшты, ня толькі ў галіне вонкавапалітычных паўнамоцтваў, але і ў нутраных дачыненьнях паміж саюзнымі рэспублікамі і цэнтральным урадам. Такім чынам, усякі подпіс БССР, УССР ці іншай саюзнай рэспублікі пад нейкім міжнародным пагадненьнем — гэта фактычна толькі мэханічнае дубляваньне пастановаў і подпісаў ураду СССР, і сам ў сабе ніякай вартасьці ня мае.

У выпадку маскоўскай умовы гэты кур'ёз даходзіць да скрайнасьці. Падпісваючы пагадненьне аб забароне ядзерных выпрабаваньняў, Беларуская і Ўкраінская ССР забавязаліся не рабіць таго, рабіць чаго яны не маглі так і так. Ува ўсіх краінах, а ўжо тым больш у Савецкім Саюзе, ядзерныя выпрабаваньні належаць да рэсорту ваенных справаў — абароны. А абарона ў Савецкім Саюзе знаходзіцца ў выключнай кампэтэнцыі цэнтральнага ўраду і рэспубліканскія ўлады ня маюць тут нічога да гутаркі. Гэтае палажэньне замацаванае ў савецкай ўсесаюзнай і рэспубліканскіх канстытуцыях. У часе тварэньня СССР савецкія, тады яшчэ быццам незалежныя, рэспублікі «дабраахвотна» зракліся ўсіх сваіх важнейшых дзяржаўных функцыяў, у тым ліку й абароны, на карысьць Саюзу.

Тым ня менш, далучэньне Беларускай ССР да міжнароднай умовы аб частковай забароне ядзерных выпрабаваньняў мае свой пазытыўны бок. Хай сабе і ня выбраныя народам прадстаўнікі, але ўсё-ж ад імя Беларусі фармальна выказаліся перад сьветам супраць атручваньня асяродзьдзя, у якім мы жывём, радыяактыўнымі ападкамі, і ў гэтым канкрэтным выпадку яны навет не разышліся з думкай беларускага народу.

Гэты крок мае бяссумлеўна пазытыўнае значэньне для будучыні. Падпісаўшы новае міжнароднае пагадненьне, Беларусь, хай і ў форме фіктыўнай БССР, узяла яшчэ раз удзел у міжнародным акце, як суб'ект міжнароднага права — як дзяржава — нароўні зь іншымі дзяржавамі сьвету. Гэта ўмацоўвае міжнароднае прызнаньне Беларусі, як дзяржавы. У дзяржаве могуць мяняцца рэжымы, але зьліквідаваць самую дзяржаву нялёгка.

Значэньне вышэйсказанага можна добра праверыць на прыкладзе тых дыпляматычных камплікацыяў, якія ўзьніклі з прычыны падпісаньня маскоўскага пагадненьня савецкай зонай Нямеччыны. Каб унікнуць інтэрнацыянальнага прызнаньня савецкай зоне Нямеччыне асобнага дзяржаўнага статусу праз ейнае далучэньне да міжнароднай умовы, заходнія дзяржавы рабілі спэцыяльныя дэклярацыі і фармальныя захады. Супраць падпісаньня маскоўскай умовы Беларускай і Украінскай ССР ніхто не пратэставаў. Гэта з тэй прычыны, што дзяржаўны статус БССР і УССР быў інтэрнацыянальна прызнаны ўжо тады, калі гэтыя дзьве савецкія рэспублікі сталіся сябрамі — заснавальнікамі Арганізацыі Аб'еднаных Нацыяў.

Гэта трэба было-б часьцей браць на ўвагу тым палітычным колам на Захадзе, якія ўсё яшчэ пацеюць над «праблемай», наколькі Беларусь ці Ўкраіну можна трактаваць асобна ад Расеі.

**А. Залескі**

# Кульмінацыйны пункт сельскагаспадарчага крызісу ў СССР

Ніхто пэўна не адкрые Амэрыкі заявіўшы, што савецкая сыстэма калгаснага земляробства цяжкім каменем вісіць на шыі савецкай сельскай гаспадаркі. Ніхто таксама не скажа нічога новага, заявіўшы, што прынятыя да гэтага часу паўмеры для выпраўленьня гэтага палажэньня не далі пазытыўных вынікаў. І ўсё-ж такі, ня гледзячы на гэта, трэба адзначыць яшчэ некаторыя мамэнты ў сельскай гаспадарцы СССР, бо справа тут ідзе ня столькі аб палеміцы ў асяродзьдзі савецкіх кіраўнікоў, колькі аб надзённым хлебе для народаў Савецкага Саюзу.

У сувязі зь дзесяцігодзьдзем «гістарычнага дакладу» Хрушчова аб мерапрыемствах далейшага разьвіцьця сельскай гаспадаркі СССР, зробленага ім на пленарным паседжаньні ЦК КПСС у верасьні 1953-га году і нядаўна адзначанага ў Савецкім Саюзе, югаслаўская газэта «Весьнік» уважала за патрэбнае прыгадаць некаторыя падрабязнасьці. Газэта зазначыла, што валавы збор збожжа ў Савецкім Саюзе ў 1953-ім годзе быў вышэйшы за валавы збор збожжа Царскай Расеі ў 1913-ым годзе. Даўшы такую ілюстрацыю «рэнтабельнасьці» сталінскага аграрнага фэадалізму, газэта падала й іншы прыклад, які не гаворыць на карысьць сёньнешніх казённых дэсталінізатараў у калгасным сэктары. Грунтуючыся на афіцыйных дадзеных, газэта «Весьнік» піша, што вытворчасьць збожжа ў Савецкім Саюзе ў 1962-ім годзе павялічылася ў параўнаньні з 1913-ым годам толькі на 133%.

Аднак, калі мы і прыпусьцім, што гэты працэнт адпавядае праўдзе, дык ён ўсё-ж-такі не зьяўляецца кампліімэнтам у адрас калгаснай сыстэмы. Запраўды што такое павялічэньне вытворчасьці збожжа на 133 %-ты пасьля столькіх гадоў калгаснага земляробства? Асабліва, калі ўзяць на ўвагу, як сказаў сам Хрушчоў у Краснадары, што «тэхнічную базу сельскае гаспадаркі ў царскай Расеі складалі плуг, саха і конь», і што, як ведама, земляробскі сэктар царскай Расеі не павялічыўся за кошт асваеньня цалінных і залеглых земляў, ня ведаў хэмічных угнаеньняў, а тым больш ня меў сучаснай сыстэмы абвадненьня. Апрача таго, трэба яшчэ дадаць, што ў царскай Расеі ня было цяперашніх сартоў збожжа і гібрыднага насеньня, разьлічаных на ўсе кліматычныя пасы Савецкага Саюзу. Дарэчы, адзначаным вышэй павялічэньнем вытворчасьці збожжа на 133 %-ты ня быў задаволены і Мікіта Хрушчоў, бо яшчэ да сакавіковага Плянуму ЦК КПСС мінулага году ён заявіў, што калі вытворчасьць прадукцыі сельскай гаспадаркі ня будзе падвоеная ці нават патроеная, дык СССР сутыкнецца зь вялікімі цяжкасьцямі. Гэтых цяжкасьцяў і не давялося доўга чакаць. Некаторыя замежныя назіральнікі ў Маскве ўважаюць, што сельскагаспадарчая прадукцыя гэтага году складае толькі 70 працэнтаў вытворчасьці мінулага году.

Як і трэба было чакаць, цяперашні крызіс калгаснае гаспадаркі перарос граніцы Савецкага Саюзу і закрануў бальшыню краінаў Савецкага блёку. Адразу пасьля паведамленьня аб тым, што савецкія кіраўнікі дамовіліся аб вялікіх даставах збожжа з Канады, Аўстраліі і некаторых краінаў Эўропы для Савецкага Саюзу, было таксама афіцыйна паведамлена, што Баўгарыя, Чэхаславаччына і Вугоршчына зьвярнуліся да Злучаных Штатаў з просьбай прадаць ім збожжа. Савецкі Саюз таксама падпісаў такое пагадненьне із Злучанымі Штатамі.

Зазначым, што партыйнае кіраўніцтва СССР на працягу шмат гадоў крытыкавала і далей крытыкуе гэтак званую дыскрымінацыю ў міжнародным гандлі, уважаючы яе тактыкай халоднай вайны. Аднак, яно і сёньня яшчэ не знайшло добрага слова ў сувязі з даставамі яму вольным сьветам збожжа. І гэта невыпадкова. Навет Індыя, у якой пануе хранічны голад, ніколі яшчэ ня купляла такой колькасьці збожжа за адзін год. Дайшло да таго, што, як паведаміла нядаўна югаслаўская газэта «Політыка», савецкія прадстаўнікі вядуць цяпер перамовы з ангельскімі фірмамі аб водкупе назад таго збожжа, якое Савецкі Саюз раней прадаў Ангельшчыне. У сувязі з гэтым выяўляюцца і іншыя дэлікатныя для савецкага ўраду дэталі. Выявілася, напрыклад, што савецкі ўрад ня мае дастатковае колькасьці замежнай валюты, каб заплаціць за збожжа набытае на Захадзе, а дзеля гэтага ён змушаны прадаваць свае запасы золата. Заходняя прэса паведаміла, што ўжо да 25-га верасьня на працягу двух месяцаў савецкі ўрад прадаў у краіны Заходняй Эўропы кала 40 тонаў золата. У выніку — цана на золата на міжнародным рынку пачала падаць. З другога боку, як беспасярэдні вынік масавых закупаў збожжа Савецкім Саюзам, цана на пшаніцу на міжнародным рынку пачала павышацца.

(Заканчэньне на 2-ой бач.)

# Абарона роднае мовы — крымінальнае злачынства

Цікавую й сумную старонку сучаснай савецка-расейскай моўнай палітыкі раскрывае так званае «Пісьмо із Редакціі» — «О чістоте языка і неясності мыслі», зьмешчанае ў цэнтральнай газэце «Ізвестія‘ з 24 верасьня гэтага году. Гэтае «Пісьмо», напісанае ў фэльетонным стылі, падпісана «спэцыяльным карэспандэнтам» названае газэты, аднак няма сумлеву ў тым, што яно выйшла ад рэдакцыі й такім парадкам — ад ураду й партыі.

«Пісьмо» разьбірае справу «Супалкі змаганьня за чысьціню мовы», якая ўзьнікла ў асяродзьдзі інтэлігенцыі Грузіі. Гэтую «Супалку», мэтай якой было змаганьне за захаваньне грузінскае мовы, заклалі чатыры супрацоўніцы Батумскага пэдагагічнага й Тыфліскага палітэхнічнага інстытутаў. Да супалкі потым далучыліся іншыя, у тым ліку й адказныя кіраўнікі грузінскага камсамолу. Як вынікае зь «Пісьма» й пададзенай у ім вытрымкі зь ліста кіраўнікоў супалкі, гэтае змаганьне было скіравана галоўным чынам супраць засьмечваньня грузінскай мовы расейскімі словамі й тэрмінамі. Як штраф за ўжываньне расейскага слова, раней супалка вымагала ад сваіх сяброў адну капейку, а потым — 20 капеяк. На сабраныя такім парадкам грошы наладжваліся супольныя сустрэчы й вечары, на якіх праводзіліся дыскусыі й г. д. Супалка вырастала, а ейны ўплыў, як зазначаецца ў «Пісьме», выйшаў навет на вуліцу гарадоў, дзе падлеткі пачалі дамагацца ўжо 50 капеяк ад сваіх сяброў за ўжываньне таго ці іншага расейскага слова ў гутарцы.

І вось на гэтую «Супалку» раптам навалілася няшчасьце. Загадам ЦК Кампартыі Грузіі, — ведама, пад ціскам ЦК КПСС, — супалка была разагнаная, а ейныя сябры, як зазначаецца ў лісьце кіраўнікоў гэтае супалкі, былі залічаныя да «антыграмадзкага элемэнту» й сурова пакараныя. Як паведамляецца ў «Пісьме», многія зь іх, асабліва камсамольскі актыў, былі пазбаўленыя працы й выкінутыя на вуліцу. Дзейнасьць «Супалкі» атрымала ярлык «нацыяналістычнай». Партыя парупілася прышыць сюды і крымінальны бок. Напрыклад, загадчык фінасавага сэктару Аджарскага абкому камсамолу Мелуа ўжо «раней быў засуджаны на 15 гадоў турмы за ўдзел у бандзе, якая займалася збройнымі нападамі». Сакратар-жа гэтага аб-

(Заканчэньне на 2-ой бач.)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011



# У якім веку вучыць дзяцей беларускай мовы і чаму?

Адзін бацька-Беларус з высокай асьветай сказаў, што малыя дзеці перш-наперш павінны вучыцца мовы краіны свайго пасяленьня, а беларускай мовы трэба вучыць дзяцей у крыху старэйшым веку, бо калі адначасова прывучаць іх да некалькіх моваў, ды не навучацца добра ні тае, ні другое.

Ёсьць і такія, што ўважаюць навучаньне беларускай мовы непатрэбным балястам для дзіцяці і, быццам, патрэба веданьня беларускае мовы — гэта толькі капрыз старэйшых, якім цяжка вывучыць мову мясцовага жыхарства.

Такія разважаньні, як першае, так і другое — ня толькі памылковыя, але і шкодныя для беларускасьці і для самых дзяцей асабіста.

Каб падзяліцца думкамі з сваімі бацькамі, дзеці павінны ведаць мову сваіх бацькоў, а каб паразумецца зь мясцовым жыхарствам — ведаць мову гэтага жыхарства. Такім чынам, беларускія дзеці павінны вучыцца дзьвёх моваў. Але ў такіх выпадках можна ўжо пачуць нараканьні бацькоў: пашто мучыць малых дзяцей навучаньнем дзьвёх моваў.

Аднак, ці запраўды дзеці ў школьным веку так перамучаныя навукай, што трэба адмовіцца навучаць іх роднай мовы, і ці навука беларускай мовы ня мае практычнае вартасьці?

На першае пытаньне адказ вельмі просты і кароткі. Мы, старэйшыя, хадзілі на Бацькаўшчыне ў школы расейскія, або польскія. Калі пачыналі вучыцца, дык ведалі толькі беларускую мову. У старэйшых-жа клясах апрача мовы выкладаньня — расейскай ці польскай — даходзіла лаціна і яшчэ француская, або нямецкая мова, а часамі і абедзьве зараз. І трэба пры гэтым сьцьвердзіць, што праграмы навучаньня былі куды абшырнейшыя. Аднак ніхто ня быў перамучаны навукай, хоць і вымогі былі шмат большыя.

Калі мы ў той час у школьным веку ня мучыліся вывучаньнем некалькіх моваў, дык хіба-ж могуць гэта рабіць і нашыя дзеці ці ўнукі, яны-ж хіба не слабейшыя за нас фізычна і разумова. Беларускія дзеці навучацца лёгка гаварыць пабеларуску, толькі для гэтага патрэбная адпаведная атмасфэра. Бацькі зь дзецьмі павінны перажываць як-бы сваю маладосьць. Маці павінна сьпяваць дзеткам такія-ж калыханкі, расказваць такія-ж казкі, якія чула ад сваёй маці, а бацька павінен адносіцца да сваіх дзяцей зусім натуральна, насьлядоўваючы свайго бацьку.

Бяссумлеўна, бацькі-эмігранты не авалодаюць ангельскую ці іншую мову ў такой ступені, як іхныя дзеці, што наведваюць мясцовыя школы. Але затое дзеці, пры найбольшай ахвоце, ня будуць гутарыць пабеларуску так, як іхныя бацькі. З гэтага дзеці зразумеюць, шо хоць яны валодаюць ангельскай ці іншай мовай лепш за бацькоў, але затое бацькі лепш ведаюць беларускую, а гэта ў сваю чаргу выклікае большы рэспэкт да бацькоў і старэйшых.

Калі беларускія дзеці і моладзь будуць ведаць мову сваіх бацькоў, дык можна спадзявацца, што хоць некаторыя зь іх з часам захочаць пазнаць гісторыю, геаграфію і культуру Беларусаў і Беларусі. Тут ня йдзе пра тое, каб убіваць у галовы нашай моладзі масу другарадных вестак, але важна, каб недапусьціць узьнікненьне ў ёй камплексу ніжэйшасьці з прычыны няведаньня свайго паходжаньня. Моладзь наша павінна быць усьведамленай, што яна паходзіць з народу, які можа пахваліцца вялікімі дасягненьнямі ў галіне культуры напрацягу сваёй тысячагадовай гісторыі.

Ёсьць адзінкі, якія ўважаюць, што вывучэньне роднае мовы мае толькі тады цану, калі гэтая мова можа быць выкарыстаная практычна. Яны разважаюць так: беларускай мовай карыстаецца толькі беларускі народ, які цяпер ізаляваны ад вольнага сьвету, а ў замежжы — Беларусы ды невялікая колькасьць тых чужынцаў, што ў свой час жылі на Беларусі. А дзеля гэтага, паіхняму, вучыцца гутарыць пабеларуску — гэта толькі страта часу.

Такім трэба паказаць адваротны бок мэдалю. Нашыя блізкія суседзі — Латышы, Летувісы, Эстонцы, ці далейшыя — Вугорцы, або Фіны — вучаць дзяцей і моладзь свае роднае мовы, хоць гэтыя народы колькасна меншыя за Беларусаў і іхныя мовы не павязаныя ў такой ступені, як мовы славянскія. Ведаючы беларускую мову, лёгка авалодаць іншыя славянскія мовы, на якіх гаворыць больш за 200 мільёнаў чалавек. Такім чынам веданьне аднае з славянскіх моваў, у дадзеным выпадку — беларускае, з кажнага гледзішча бясспрэчна будзе вельмі каштоўным здабыткам для нашае моладзі. Доказам гэтага зьяўляецца і той факт, што цяпер, прыкладам, амэрыканскія дзейнікі заклікаюць і заахвочваюць былых эмігрантаў, а цяпер грамадзянаў ЗША, не забывацца мовы краю свайго паходжаньня. Ці-ж гэта не найлепшы аргумант супраць тых, што ўважаюць непатрэбным вучыць сваіх дзяцей беларускай мовы?

Вучыць дзяцей беларускай мовы трэба ўжо ад пялёнак. Дзеці ў веку перадшкольным найлепш і незаўважна засвойваюць гукавыя асаблівасьці мовы, што старэйшым даецца куды цяжэй. Апрача гэтага, кажны ведае з свайго асабістага дасьветчаньня, што ўсё засвоенае у наймаладзейшым веку куды лепш памятаецца, чымся вывучанае ў веку старэйшым.

У мяшаных сужэнствах, дзе родная мова бацькі іншая ад роднае мовы маці, яны павінны гутарыць зь дзяцьмі кажны ў сваёй роднай мове, і дзеці вельмі лёгка навучацца аднае і другое мовы. Важна толькі, каб у такіх выпадках бацькі не ўважалі, што пэўная мова важнейшая, чымся беларуская.

Калі мы будзем гэтага прытрымоўвацца, дык ня будзе небясьпекі што новае пакаленьне беларускай эміграцыі бясьследна росплывецца ў моры мясцовага насельніцтва краінаў пасяленьня Беларусаў.

**Я. Чарнэцкі**

# Аўген Кавалеўскі

13-га жнівеня 1963 году, ў шпіталі Royan (Charente Maritime, Францыя) закончыў свой жыцьцёвы шлях Аўген Кавалеўскі. Памёр ён ад кампілкацыяў пасьля апэрацыі страўніка. Пахаваны на мясцовым могільніку ў Mathes (каля Royany).

Ягоны жыцьцёвы шлях быў нялёгкі.

Нарадзіўся сьв. пам. Аўген Кавалеўскі 7-га студзеня 1921-га году ў Маскве, куды быў пасланы на працу ягоны бацька. Два тыдні пасьля ягонага нараджэньня ўся сям'я вярнулася ў Менск, дзе Аўген падрастаў і хутка пайшоў у дзіцячы садок, якім кіравала цётка Уладзя (так называлі ў беларускім асяродзьдзі жонку Янкі Купалы). Спадарства Купалы вельмі яго палюбілі і вучылі беларускай мовы. Пасьля Аўген пайшоў у 45-ую школу (дзесяцігодку) ў Менску і закончыў яе з выдатнымі адзнакамі. У міжчасе страціў свайго бацьку, які стаўся ахвярай бальшавіцкага тэрору ў часы ліквідацыі «нацдэмаўшчыны».

У свае юнацкія гады Аўген Кавалеўскі выяўляў артыстычныя здольнасьці і любоў да тэатру. Стацца артыстым было ягонай мрояй. Ён браў удзел у пастаноўках тэатру «Юнага гледача» і зьвярнуў на сябе ўвагу ведамага тэатральнага дзеяча і рэжысэра Міровіча, які заўсёды клапаціўся аб выхаваньні тэатральнай моладзі. Міровіч накіраваў яго ў тэатральную школу пры Беларускім Дзяржаўным Драматычным Тэатры, дзе Аўген зь вялікімі надзеямі пачаў заняткі. Але вайна 1941-га году перакрэсьліла ўсе ягоныя пляны і не дала магчымасьці закончыць тэатральную асьвету.

Вельмі любячы мастацтва й маючы некаторую практыку ў артыстычнай працы ў юнацкія гады, Аўген Кавалеўскі ў часе вайны з энтузіязмам улучыўся ў працу аднаўленага ў Менску Тэатру, а таксама браў удзел, як выканаўца і канфэрансье, у канцэртных праграмах.

Але й гэта ня было трывалым. У 1944-ым годзе пад ціскам бальшавікоў Аўген зь сям'ёй выехаў зь Менску і апынуўся ў Нямеччыне.

Тут ізноў ён пачаў працаваць на тэатральнай ніве. Стараньнямі беларускіх сацыянальных арганізацыяў быў зарганізаваны беларускі ансамбль Песьні і Танцу «Жыве Беларусь», які стварыўся зь беларускіх опэрных, балетных, драматычных, кампазытарскіх і музычных сілаў, што воляй лёсу апынуліся на эміграцыі.

Ансамбль «Жыве Беларусь» зь вялізарным посьпехам аб'яжджаў усе куткі, дзе толькі знаходзіліся Беларусы, і роднай песьняй, танцам і словам аблягчаў цяжкое жыцьцё выгнанцаў.

І тут, у цяжкіх умовах вандроўнага жыцьця, сьв. пам. Аўген Кавалеўскі паказаў сябе энэргічным, адданым беларускай справе, добрым і чулым сябрам, добрым арганізатарам. Ён пісаў п'есы і скетчы для Ансамблю, сам быў вельмі добрым выканаўцам. Напісаная ім камэдыя «Нечаканыя заручыны» карысталася вялізарным посьпехам у гледача.

Разам зь ім у Ансамблі працавала, у якасьці касьцюмершы, і ягоная маці.

Пазьней Ансамбль «Жыве Беларусь» ператварыўся ў Тэатр Эстрады. І тут шмат працы й энэргіі ўклаў сьв. пам. Аўген Кавалеўскі. У вадной з праграмаў ён стварыў выдатны вобраз Данілы з опэры «Купальле». У іншых праграмах Тэатру Эстрады таленавіта граў у скэтчах і п'есах, быў канфэрансье і, апрача таго, выконваў цяжкую арганізацыйную працу й афармленьне сцэны.

Ня гледзячы на часамі цяжкое жыцьцё, на стомленасьць, ён быў заўсёды жыцьцярадасным, поўным энэргіі, зь мілай усьмешкай на твары.

Пасьля разьвязаньня лягероў у Нямеччыне, Аўген Кавалеўскі пераехаў у Францыю, дзе былі думкі зарганізаваць тэатральную аматарскую групу. Нажаль, гэтых мрояў яму не ўдалося зрэалізаваць.

Прыехаўшы ў Францыю, Аўген Кавалеўскі спачатку працаваў там як звычайны работнік у індустрыяльным горадзе Thienville (Moselle), а пасьля году пераехаў у Парыж і знайшоў працу ў кравецкім атэлье, дзе маючы добры мастацкі густ і багатую творчую фантазію, ён хутка выявіў сябе як таленавіты выканаўца эскізаў парыскае моды і меў там прызнаньне й вялікі аўтарытэт. У гэтым фаху працаваў ён аж да апошняга часу.

Але ён не пакідаў і культурна-грамадзкай працы. Зь мясцовымі й запрошанымі мастацкімі сіламі ён наладжваў канцэртныя праграмы у часе ўрачыстых акадэміяў і беларускіх нацыянальных сьвятаў, адзначаных парыскімі нацыянальнымі беларускімі арганізацыямі.

У Парыжы Аўген Кавалеўскі выказаў сябе як адданы й ахвярны супрацоўнік часапісу «Моладзь», ды ахвярны супрацоўнік сындыкальнае арганізацыі беларусаў у Францыі А.Б.Р.Ф., у якой некалькі гадоў быў сакратаром. Ён часта прадстаўляў гэтую арганізацыю на міжнародных сустрэчах.

Раптоўная сьмерць Аўтена Кавалеўскага моцна ўскалыхнула ня толькі ўсіх Беларусаў у Францыі, але і ўсіх тых людзей, якія мелі нагоду ведаць Кавалеўскага. Яго любілі за ягоную памяркоўнасьць, дабрату, вясёлы характар, гумар ды дынамічны палёт, які ён выяўляў ува ўсіх пачынаньнях. Ён, што так моцна любіў жыцьцё і так адважна за яго змагаўся, мусіў у страшэнных муках зь ім растацца у 42 гады жыцьця, у росквіце сілаў і здольнасьцяў. Сьпіць вечным сном далёка ад Беларусі, дый далёка ад сям'і, бо сьмерць наступіла падчас адпачынку ў прыморскім горадзе Royan і было немагчымым перавезьці цела сябожчыка ў Парыж.

Сьв. пам. Аўген Кавалеўскі пакінуў у Францыі жонку, дзьвюх прыгожых і здольных дачушак, матку й брата. Сёньня яны, а таксама ўсе Беларусы Францыі і блізкія сябры й калегі, складаюць Аўгену апошнюю пашану.

Дык прымі яе, Дарагі наш Сябра, бо Ты на яе заслужыў. Няхай над далёкім Атлянтычным Акіянам сьняцца Табе сны аб Беларусі, тэатры, ды аб Тваёй сямейцы, якая ў сьлязох Цябе ўспамінае.

**Ад Ураду А.Б.Р.Ф. М. Наўмовіч**
**і сябры й калегі па працы й тэатры**

## АД РЭДАКЦЫІ

**Сябры рэдкалегіі «Бацькаўшчыны» далучаюцца да выказаных вышэй спачуваньняў. У асобе пакойнага Аўгена Кавалеўскага «Бацькаўшчына» страціла свайго вартаснага супрацоўніка.**

**Гэтым шляхам Рэдакцыя нашай газэты, а таксама ўся мюнхэнская беларуская калёнія выказвае свае наглыбейшыя спачуваньні сям'і Памерлага.**

# XIII Кангрэс „Царква ў бядзе“

А 2 да 6 жнівеня ў Кэнігштайне адбываўся XIII з чаргі Кангрэс «Царква ў бядзе». На Кангрэс зьехаліся прадстаўнікі ўсіх паняволеных камунізмам народаў, каб у супольных малітвах прасіць Усявышняга Ягонай ласкі для палёгкі долі паняволеных.

Беларускую дэлегацыю на Кангрэсе ачольваў пралат А. Салавей.

Кангрэс адбываўся пад знакам малітваў, Багаслужбаў і дакладаў аб рэлігійным палажэньні рэпрэзэнтаваных на Кангрэсе народаў. Справаздачу аб рэлігійным палажэньні на Беларусі прачытаў інж. Сяргей Гох. У прэсавай частцы Кангрэсу ад Беларусаў браў удзел сп. Ч. Кукель.

Кульмінацыйным пунктам Кангрэсу была Багаслужба ў нядзелю 4 жнівеня, якую адправілі: ад Украінцаў уладыка Платон, а ад Беларусаў монсіньёр Салавей у саслужэньні шматлікага духавенства. У часе Багаслужбы сьпяваў бізантыйскі хор з Утрэхту.

Сярод шматлікіх прывітаньняў галоўнае месца займала прывітаньне ад Сьвяцейшага Айца Паўла VI.

**НІВОДНАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ, ТАВАРЫСКАЯ Й СЯМЕЙНАЯ ЎРАЧЫСТАСЬЦЬ НЕ ПАВІННА АДБЫЦЦА БЯЗ ЗБОРУ СЯРОД ПРЫСУТНЫХ АХВЯРАЎ НА ВЫДАВЕЦКІ ФОНД «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ»!**

---

добрым каньяком. Халерачка! На базе яны ўсё маюць... Мулы прынялі мяне абыякава, мулаводы — няпрыязна. Я пачаў гаварыць зь імі ламанай ангельска-італьянскай мовай, бо грэцкай, прызнацца, праз ляніўства ня вывучаў. Як я прыгадваў — мулаводы пераважна зь Кіпру. Брудныя, аброслыя й злосныя. Толькі пазьней выявілася, што гэта былі запраўды добрыя, адважныя і ляяльныя хлопцы. Іхная няўдзячная праца дэпрымавала іх і ня спрыяла іхнаму прыроджанаму гумару ды вясёласьці.

Я мусіў іх вясьці, таму выпадала сказаць некалькі слоў. А што я мог сказаць навет праз перакладчыка?

— Хлопцы, мяне прызначылі праваднікОм і, быццам-бы, камандзерам. Я разьведаў дарогу, па якой мы будзем хадзіць. У гэтым праклятым раёне сьмерць пагражае ўсюды, таму можам спадзявацца, што і на гэтай, разьведанай мной дарозе, можа нехта з нас зьгінуць. Аднак заданьне выконваць мусім. Таму, слухай маю каманду! За мной!

Я меў уражаньне, што маю прамову найбольш уважна слухалі мулы, бо яны ківалі галовамі й стрыглі вушамі.

Усё-ж пайшлі. Якмага хутчэй пераскочылі даліну й брод ды пачалі ўзлазіць на гару. Тут мул, можна сказаць, неэлегантны твор, дыстансуе, як гэта шумна гаворыцца, валадара прыроды — чалавека. Як-жа ён субтэльна вычувае кажную горбінку, за якую можна зачапіцца капытком! Мулаводы падаюць, коцяцца ўніз, а мул спакойна ідзе на гару.

Недалёка ад першага этапу, які я прадбачваў, пачала біць артылерыя.

— Прэсто, прэсто! (паітальянску — хутчэй, хутчэй!) — крычу і хапаю першага мула за аброць ды цягну яго наперад. Дабеглі за скалу бяз стратаў. Перачакалі навалу ды пайшлі далей. Дайшлі да мэты. Пакуль мулаводы разьючвалі мулоў, я пабег у батальён і змабілізаваў экіпу жаўнераў, каб забралі транспарт. І вось з гэтымі муламі й мулаводамі я на золаку быў на базе.

На базе мне навет падабалася. Днём я мог бясьпечна ляжаць у цені аліўкаў, добра й смачна пад'есьці пад ўвіскі ці каньяк, а ўначы прайсьці ўжо знаёмую трасу з муламі да батальёну. Пры гэтым я быў у курсе справы. Напрыклад, я ведаў, што Ліс навудзіў рыбы і смачна паабедаў, запіў гэта добрым вінам і вясёлы, сьвежы прыехаў на камандны пункт нашага корпусу, што жартаваў, сьмяяўся й абяцаў неўзабаве новую радасьць для нас — другі штурм Монтэ Касына.

Штурм адкладаўся з дня на дзень, бо Ангельцы тапталіся над рэчкай Гары, а ўсё мела ісьці зсынхранізавана і раўналегла. Ня ведаю, як гэта падабалася мулом, але мулаводы й жаўнеры лаяліся паводля ўсіх правілаў няцэнзуральнай тэхнікі.

А там, наперадзе, крывавяцца 14 і 16 батальёны з нашай дывізіі, на лева ад нас выбіваюць 2-гі батальён Карпацкай дывізіі й два палкі ўланаў.

Трэба прыгадаць, што фронт расьцягваўся на даволі вялікай адлегласьці, бо ад Тырэнскага мора да Монтэкайро. Уздоўж узьбярэжжа Тырэнскага мора йшла Пятая амэрыканская армія. З правага боку ад яе па гарах Абруццы наступалі Французы. Далей направа — Восьмая ангельская армія, у склад якой уваходзілі мы і знаходзіліся цалкам на правым крыле фронту. Пры гэтым мы былі найдалей заавансаваныя. Такім чынам, каб пераламаць пазваночнік гэтай абароннай лініі, трэба было, каб мы, адразаючы Монтэ Касыно, маглі спалучыцца з ангельскай арміяй.

Тымчасам ангельская армія крывавіцца над рэчкай Гары, наш корпус таксама крывавіцца амаль бязьдзейна на пазыцыях, або ў ямах, а я ваджу мулоў.

Трэба сказаць, што як у кажнай пары году ёсьць свой чар і рамантызм, так і ў кажным выкананьні нейкай працы ці заданьня ёсьць і прывабныя бакі. Водзячы мулоў і мулаводаў, я студыяваў іхную псыхіку. Вось-жа, не зважаючы на даволі няпрывабную постаць мула, ён інтэлігэнтная й разумная жывёліна. Пэўна-ж, мулаводы, злосныя на свае ўмовы й абставіны працы, падыходзяць да мула брутальна. Мул, таксама, пачынае быць злосны. Але хоць яго пагладзіць па шыі ці паказытаць пад барадой, ён успакойваецца і туліцца да чалавека, як да прыяцеля. Шкада, што мул ня можа гаварыць! Ён тады мог-бы мне нешта сказаць, можа навет адкрыць нейкую праўду, аб якой ня сьнілася філязофам.

Мулаводы таксама выявіліся сымпатычнымі й вясёлымі хлопцамі, калі яны маглі адпачыць, добра папалудняваць, запіўшы гэта добрым вінам. Толькі шкада, што зь імі было цяжка паразумецца з прычыны мовы. Даводзілася больш гаварыць рукамі й нагамі...

Кажуць, што «чымбольш пазнаеш людзей, тымбольш любіш зьвяроў». Аднак і людзей падчас можна любіць, а перш за ўсё ў цяжкіх абставінах, дзе выяўляецца людзкасьць. Часамі людзі ня могуць жыць адзін з другім, але могуць адзін за другога паміраць.

Усё на сьвеце мае свой канец. Так ноччу з 16-га на 17-га травеня скончылася мая дыктатура над муламі й мулаводамі.

Давёўшы апошні транспарт, я атрымаў загад застацца ў батальёне. Я ведаў, што гэта значыць: заўтра другі штурм. Шчыра прызнаючыся, пасьля стольскіх перапалак і трох, хоць лёгкіх ранаў, хіба не абразіўся-б, калі-б мяне далей пакінулі дыктатарам мулаводчай брыгады. Я таксама, як Валодзька, зьняверыўся, што зраблю кар'еру Напалеона. Аднак загад — загад. Іду разьвітацца з мулаводамі й муламі. Калі першую маю прамову найбольш уважна слухалі мулы, дык цяпер яе слухалі і мулаводы і мулы. Што я мог сказаць? Прамова была кароткая, чаго прытрымоўвацца я радзіў-бы усім нашым аратарам.

— Arrivederci, amieci! Miei tanti auguri molto felicita...

Пацісьнуў руку кажнаму Грэку-мулаводу, пагладзіў кажнага мула. І тады я вычуваў, што кажны поціск рукі — цёплы, шчыры й сардэчны, а кажны мул прытуліў да мяне сваю, можа няпрыгожую, але сымпатычную галаву.

Часам цяжка расставацца навет з прыгоднымі прыяцелямі, ня гледзячы, ці яны ходзяць на дзьвюх, ці на чатырох нагах...

У батальёне ўжо ўсе ведалі, што заўтра, 17-га травеня, штурм. Сівы палкоўнік і пару афіцэраў уважна глядзелі ў твары жаўнераў. Але жаўнеры прынялі гэтую вестку з спакойнай дэтэрмінацыяй. Кажны браў якнайбольшую колькасьць амуніцыі й ручных гранатаў, спраўджаў свой «томпсан» ці снайпэрскую люнэту ды іншыя сьмерцяносныя прылады. Тады сівы палкоўнік першы раз за некалькі дзён усьміхнуўся: Значыцца пойдуць...

І пайшлі...

(Працяг будзе)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

